# З беларускім каларытам

З 5 па 11 чэрвеня праходзіла **рэспубліканская** турыстычная **акцыя.**

Рэспубліканская акцыя **«Вандруй. Адчуй. Натхняйся»** другі год запар праводзілася **з мэтай папулярызацыі** ўнутранага турызму Рэспублікі Беларусь.



По задумцы арганізатараў суб'екты галіны ў першы тыдзень лета, у пачатку канікул і адпускной пары, гасцінна адчыняюць дзверы перад наведвальнікамі, каб тыя захацелі вандраваць, каб адчулі каларыт роднай краіны і натхніліся гісторыяй, пакінутай у спадчыну.

Да сёлетняй акцыі ў Полацку і Полацкім раёне прымеркавалі 60 мерапрыемстваў з удзелам 21 суб'екта турызму. Актыўна запрашалі наведвальнікаў музеі ўстаноў адукацыі, у якіх гасцей абслугоўвалі бясплатна. Рады былі дарослым і дзецям спецыялісты аддзела турызму і актыўнага адпачынку Полацкага раённага цэнтра дзяцей і моладзі. Акрамя таго, што на тэрыторыі Цэнтра можна было наведаць вяровачны гарадок, турыстаў яшчэ і забаўлялі.

На некалькі мерапрыемстваў акцыі запрасілі карэспандэнтаў нашай газеты. Якія мы атрымалі ўражанні? Самыя найлепшыя! Уласна я радавалася кожнай сустрэчы з цікаўнымі людзьмі, якія пажадалі быць турыстамі ў нашым Полацку. Так хацелася на мерапрыемствах убачыць як мага больш гасцей, каб не дарэмна стараліся ўдзельнікі акцыі.







## ПРА ШЧАСЦЕ І КАХАННЕ



Каля 30 чалавек — людзі розных узростаў і нацыянальнасцяў — наведалі бясплатную 30-хвілінную экскурсію па комплексе Полацкага калегіума, арганізаваную турыстычным цэнтрам Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Еўфрасінні Полацкай.

Цікавай была міні-экскурсія па тэрыторыі калегіума, па першым паверсе будынка ўстановы адукацыі, і нікога не пакінула раўнадушным «размова з механічнай галавой». На пытанне, што такое шчасце, мудры старац адказаў: *«Калі многія гавораць пра шчасце, то напэўна ўяўляюць нешта вялізнае, што аднойчы ўпадзе на іх з неба. А на самой справе шчасце заключаецца ў дробязях. Яны акружаюць вас кожны дзень, трэба проста навучыцца іх заўважаць»*. Таксама былі выказаны цікавыя філасофскія думкі пра розныя з'явы жыцця. Экскурсантаў запрасілі наведаць універсітэцкі дворык, дзе яны падзівіліся на галерэю з карцін беларускіх мастакоў, убачылі старадаўні калодзеж, якім карысталіся спачатку іезуіты, а потым кадэты, музычны гадзіннік з фігуркамі выбітных гістарычных дзеячаў полацкай зямлі і мелі магчымасць сфатаграфавацца на алеі каляровых парасонаў, якая працавала з нагоды 55-гадовага юбілею ўстановы адукацыі.

## СМАЧНА ЕСЦІ!

Прыватнае кафэ «Раздолъ» запрасіла гасцей на прэзентацыю беларускага баршчу. Адміністратар аб'екта Антаніна Драздовіч распавяла пра старадаўні рэцэпт стравы без капусты, затое з часнаком і салам. Даведацца пра гісторыю баршча і сакрэтах яго прыгатавання пажадалі 27 чалавек.



На наступны дзень бясплатна частавалі наведвальнікаў у кафэ «Даміан». Тут зладзілі дзень беларускай кухні з дранікамі і дзерунамі. *«Не трэба дадаваць да бульбы муку»*, — навучала гасцей загадчык кафэ Святлана Адахоўская. Іх повар Наталля Драздова гатуе бульбяныя бліны штодзень, у меню ёсць дранікі з грыбамі, рознымі мяснымі начынкамі, нават бульбяная піца. Афіцыянт Алена Азаркова расказала, што наведвальнікі прыходзяць у кафэ, каб паесці як дома. І ўвесь дружны калектыў кропкі харчавання імкнецца ім дагадзіць. Наконт упрыгожання інтэр'ера кафэ жанчыны адзначылі, што ўладальнік Аляксандр Казлоў шмат зрабіў, каб у памяшканні быў сельскі каларыт, а таксама пастаянныя наведвальнікі падарылі кафэ рэдкія старадаўнія рэчы.

Сталовая «Чабор» ААТ «Полацк-гандаль» таксама правяла дзень беларускай кухні. Загадчык вытворчасці Ірына Тарасевіч расказала, што наведвальнікі з задавальненнем купляюць традыцыйныя беларускія халаднік па-мінску са смятанай, малочны суп па-магілёўску. Вялікай папулярнасцю карысталіся клёцкі са смятанай. *«Першую партыю — 80 штук — прадалі. Нашы людзі любяць клёцкі!»* — задаволена адзначала Ірына Уладзіміраўна. Каб стварыць святочны настрой і падтрымаць тэматыку дня беларускай кухні, повары апрануліся ў нацыянальныя касцюмы, і наведвальнікі гаварылі ім кампліменты.





## ГАСЦІННА ЗАПРАШАЕМ





Некалькі аграэкасядзіб у розных кутках Полаччыны правялі дні адчыненых дзвярэй. Клуб воднага турызму «Байдарачнікі Полаччыны» арганізаваў сплаў па Заходняй Дзвіне для жыхароў гарадоў-суседзяў, якія ўзялі з сабой у вандроўку братоў меншых — сабак. Полацкі раённы ФСК «Прыдзвінне» падрыхтаваў інтэрактыўную экскурсійную праграму «Полацкая кухня. Стравы з глыбінкі».

Усе ўдзельнікі акцыі падарылі турыстам радасць знаёмства з гісторыяй і культурай нашага краю, з яго традыцыямі, прыродай, звычаямі і норавамі.

